# Новыя помінкі прыроды

**Прапануем кароті агляд навацый прыродаахоўнага заканадаўства. У адпаведнасці з пастановамі Мінпрыроды абвешчаны новы батанічны помнік прыроды рэспубліканскага значэння — «Вяз-старажыл у вёсцы Талуі», а таксама пераутвораны батанічны помнік прыроды рэспубліканскага значэння «Парк Грудзінаўскі» шляхам змены яго найменя, межаў, плошчы, рэжыму аховы і выкарыстання. Трэцяя навацыя тычыцца забароны на аматарскае рыбалоуства на ўчастку ракі Заходняя Дзвіна.**

**Вяз-старажыл**

Пастановай Мінпрыроды ад 5 красавіка 2021 года № 7 абвешчаны батанічны помнік прыроды рэспубліканскага значэння «Вяз-старажыл у вёсцы Талуі». Ён знаходзіцца у Маладзечанскім раёне Мінскай вобласці. Гэта кропка на карце добра вядомая турыстам: тут размешчаны Грудзінаускі палацава-паркавы ансамбль — помнік палацава-паркавай архітэктуры позняга класіцызму. Калі палац належаў графскаму роду Талстых, у парку раслі каля 60 розных, у тым ліку рэдкіх відаў дрэў і кустоў. Некаторыя з іх захаваліся да нашых дзён: хвоя кедравая севрская, елка змеепадобная, ліпа крымская, туя і таполя канадскія, ясень пенсільванскі. У заходняй частцы парку знаходзіцца штучнае возера плошчай у тры гектары.

Турфірмы Мінска, Гродна, Магілёва прапаноўваюць экскурсіі па Быхаўшчыне з наведваннем адной з жамчужын гэтага рэгіёну — Грудзінаўскага палацава-паркавага ансамбля.

**Рыбнай лоулі — «не»**

У сувязі з прыняццем пастановы Мінпрыроды ад 6 мая 2021 года № 10 устаноўлена забарона на аматарскае рыбалоўства у перыяд з 9 чэрвеня 2021 года па 9 красавіка 2026 года у Віцебскім раёне Віцебскай вобласі на ўчастку ракі Заходняя Дзвіна ад плаціны Віцебскай гідраэлектрастанцыі на адлегласгі 800 метраў уніз па цячэнні да месца ўпадзення ракі Лужаснянкі.

**Ксенія КАВАЛЕУСКАЯ**

Ініцыятыву мясцовых жыхароў аб прызнанні ўнікальнага дрэва батанічным помнікам падтрымалі вучоныя Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН Беларусі, якія ў 2018 годзе абследавалі вяз. Яны прыйшлі да высновы, што старажылу прыкладна 230 гадоў. Уражваюць яго біяметрычныя характарыстыкі: вышыня дрэва — 25,2 метра, перыметр ствала на вышыні 1,3 метра складае без малога сем метраў, плошча кроны — 383 м$^2$.

Нагадаем, што на тэрыторыі Маладзечанскага раёна ёсць батанічныя помшю прыроды мясцовага значэння — «Лістоўніца ў Лебядзеўскім лясніцтве», «Парк Бярэзінскае», «Парк Маліноушчына», «Парк Яхімоўшчына», геалагічныя — «Гара Капланшчына», «Гара Курган», «Гара Маяк». Усе гэтыя аб'екты з аднаго боку патрабуюць павышанай увагі прыродаахоўных органаў, з другога — з'яуляюцца месцамі прыцягнення турыстаў.

**Парк у Грудзінаўцы**

У адпаведнасці з пастановай Мінпрыроды ад 3 мая 2021 года № 8 пераўтвораны батанічны помнік прыроды рэспубліканскага значэння «Парк «Грудзінаўскі» шляхам змены яго найменя, межаў, плошчы, рэжыму аховы і выкарыстання. Ён размешчаны ў аднайменнай вёсцы Быхаўскага раёна Магшёўскай вобласщ. Нагадаем, што статус помшка прыроды парк мае яшчэ з 2008 года.

Ксенія Кавалеўская

**Источник:** Родная прырода. – 2021. – № 7. – С.